І.А.Малахава, *дацэнт*

# ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ МУЗЫЧНЫХ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЙ

Эфектыўнае развіццё грамадства сёння немагчыма без паўнацэннага функцыянавання адукацыйнай сістэмы наогул і вышэйшай адукацыі ў прыватнасці.

Абнаўленне і пераасэнсаванне парадыгмаў сучаснай адукцыі сведчаць аб прызнанні таго факта, што менавіта ў гэтай сферы знаходзяцца крыніцы перабудовы і заключаюцца прычыны многіх сацыяльных праблем. Сутнасць вучэбнай дзейнасці ў вышэйшай школе не толькі і не столькі ў забеспячэнні, перадачы гатовых ведаў, колькі ў арганізацыі прадуктыўнай пазнавальнай дзейнасці студэнта і навучанні яго тэхналогіі самастойнага набыцця ведаў.

Вызначальная роля самастойнай работы абумоўліваецца тым, што менавіта яна — аптымальны шлях актывізацыі пазнавальнай дзейнасці, развіцця пошукавага стылю мыслення,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

фарміравання творчай актыўнасці асобы. Студэнцкі ўзрост — перыяд інтэнсіўнага набыцця ведаў, адбору і трансфармацыі іх у асобасны фонд развіцця. У гэтым сэнсе самастойнасць у навучанні — складаная, інтэгратыўная ўласцівасць асобы, якая, будучы сфарміраванай, з'яўляецца адным з вядучых фактараў дасягнення высокага ўзроўню вучэбнай і прафесійнай паспяховасці. Цяжка ўявіць, што студэнт, не падрыхтаваны ў ВНУ да самастойнага набыцця ведаў, здолее развіць у сабе гэтыя якасці ў працэсе прафесійнай дзейнасці.

Неабходна адзначыць шматбаковае асвятленне агульнапедагагічных і метадычных пытанняў самастойнай работы як навукоўцамі-даследчыкамі, так і педагогамі-практыкамі.

Найбольш лагічна, на нашу думку, вызначыць самастойную работу як вучэбна-пазнавальную, навукова-даследчую і творчую дзейнасць, якую выконваюць студэнты ў пазааўдыторны час, без удзелу ў ёй выкладчыка і накіраваную на поўнае засваенне вучэбнай праграмы, самаразвіццё і самаўдасканаленне.

Мэта самастойнай работы студэнтаў у дадзеным кантэксце заключаецца ў выпрацоўцы ўменняў і навыкаў пастаяннай самаадукацыі, а таксама ў асваенні тэхналогіі самастойнай пазнавальнай і творчай дзейнасці.

Калі размова вядзецца аб арганізацыі самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, то неабходна ўяўляць кампаненты гэтай дзейнасці, іх узаемасувязь і ўзаемазалежнасць, ведаць мэты і задачы таго ці іншага этапу навучання, каб мець магчымасць выбраць адэкватныя сродкі і метады для вырашэння пастаўленых задач.

Такім чынам, арганізацыя самастойнай работы студэнтаў — гэта дзейнасць як кіраўніцкая, так і выканаўчая, у працэсе якой складваюцца міжасобасныя адносіны. Вынікі гэтай дзейнасці залежаць ад выкладчыка і ад студэнтаў. Разам з тым яна

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

(самастойная работа) рэгламентуецца спецыяльнымі нарматыўнымі дакументамі як на ўзроўні міністэрства, так і на ўзроўні ўнутрыуніверсітэцкага карыстання.

Аднак нерэгулярнасць, эпізадычнасць і павярхоўны характар самастойнай работы сталі сёння дастаткова распаўсюджанай з'явай і асноўнай прычынай нізкай паспяховасці студэнтаў.

Сістэму універсітэцкай адукцыі, якая бярэ пачатак у сярэднявеччы і заснавана на цікавасці і імкненні студэнтаў да авалодвання навукамі, у нашых сучасных умовах неабходна сутнасна ўдасканальваць. Час свабоднага наведвання лекцый і навучання зацікаўленых людзей прамудрасцям навукі даўно прайшоў. Сёння патрэбна штодзённая карпатлівая работа студэнта па авалодванні даволі вялікім пералікам навуковых дысцыплін, вельмі важных для прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў.

У сувязі з гэтым нельга не ўлічваць псіхафізіялагічныя асаблівасці ўзросту другога юнацтва, да якога належаць студэнты. Як вядома, кожны ўзроставы перыяд у жыцці чалавека адрозніваецца павялічанай чуласцю (сензітыўнасцю) да тых ці іншых бакоў развіцця. Юнацкі ўзрост у гэтых адносінах выключна сензітыўны да інтэлектуальна-эмацыянальнага развіцця, гэта значыць да развіцця мыслення, кемлівасці, памяці і пачуццёвай сферы. Але развіццё будзе адбывацца толькі пры ўмове сістэматычнага трэнінгу мысліцельнай здольнасці і памяці. Гэта становіцца магчымым, галоўным чынам, у працэсе самастойнай пазааўдыторай работы студэнтаў, якая, паводле думкі розных навукоўцаў, павінна складаць ад 2—3 да 5 гадзін у дзень.

Аднак на практыцы бывае не заўсёды так. Не ўсе студэнты займаюцца ў поўную сілу. У некаторых выпадках прысутнічае так званая "інтэлектуальная штурмаўшчына", калі ў час сесіі назапашваецца вялікі аб'ём ведаў па розных дысцыплінах. І

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

гэтыя веды, на жаль, так і застаюцца ў аператыўнай памяці, не пераўтвараючыся ва ўменні і навыкі.

Усведамленне гэтай праблемы вымушае выкладчыкаў вышэйшай школы да пошуку шляхоў больш дзейснага стымулявання самастойнай вучэбна-пазнавальнай работы студэнтаў. Так, можна з поўнай дакладнасцю сцвярджаць, што існуе навукова распрацаваная мадэль працэсу самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Гэты працэс уключае, па-першае, фарміраванне патрэбнасна-матывацыйнай сферы, стымулюючай студэнтаў да навучання; па-другое, арганізацыю поўнага цыкла пазнавальных дзеянняў па авалодванні ведамі (успрыманне, асэнсаванне, запамінанне, прымяненне на практыцы і наступнае паўтарэнне); па-трэцяе, ажыццяўленне кантролю і самакантролю за якасцю засваення ведаў.

Дадзеная мадэль арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці мае дастаткова выразныя арыенціры ўдасканалення і актывізацыі універсітэцкага навучання. Яно павінна ажыццяўляцца так, каб уся гэта арганізацыя стымулявала студэнтаў здзяйсняць поўны цыкл вучэбна-пазнавальнай дзейнасці па самастойным авалодванні вывучаемага матэрыялу. Вось чаму вельмі важным аспектам універсітэцкага навучання з'яўляецца аказанне неабходнай дапамогі студэнтам у засваенні тэхналогіі вучэбнай работы. Колькасць і якасць самастойнай вучэбнай працы студэнтаў у многім залежаць ад эфектыўнасці выбраных выкладчыкам метадаў, ад яго ўмення арганізаваць і накіраваць дадзеную работу ў неабходнае рэчышча.

У дыдактыцы вылучаюцца віды самастойнай работы па розных адзнаках, што абумовіла з'яўленне разнастайных яе класіфікацый.

Ва ўмовах ВНУ культуры нам падаецца асабліва карыснай класіфікацыя відаў самастойнай работы па спосабе выканання заданняў і характары пазнавальнай дзейнасці. У адпаведнасці з

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

ёю ўсе віды самастойнай работы можна падзяліць на чатыры групы.

Да першай адносяцца ўзнаўленчыя самастойныя работы, калі дзейнасць студэнтаў накіравана на вывучэнне, запамінанне і ўзнаўленне вызначанай інфармацыі. Сюды адносіцца таксама работа з узорам у тым ці іншым выглядзе.

Другую групу складаюць рэканструкцыйна-варыятыўныя самастойныя работы, патрабуючыя розных перабудоў, абагульненняў, прыцягнення раней набытых ведаў і ўменняў дзеля вырашэння праблем.

У трэцюю ўваходзяць эўрыстычныя самастойныя работы, у працэсе выканання якіх намаганні студэнтаў накіраваны на вырашэнне праблемнай сітуацыі, якую арганізуе выкладчык. Такая пазнавальная дзейнасць садзейнічае авалоданню элементамі творчасці.

Чацвёртую групу складаюць заданні, якія патрабуюць вышэйшага ўзроўню самастойнасці, дзе прадугледжваецца выкананне творчых, даследчых заданняў. Тут неабходныя ўменні раскрываць новыя бакі з'яў і аб'ектаў, выказваць асабістыя думкі і ацэнкі, бачыць і фармуляваць праблемы.

У арганізацыі самастойнай работы студэнтаў праяўляецца здольнасць выкладчыка ствараць неабходныя ўмовы для рэалізацыі гатоўнасці і жадання студэнтаў дзейнічаць самастойна ў адпаведнасці з асабістымі матывамі і мэтамі. Вялікае значэнне мае стварэнне атмасферы добразычлівасці, даверу, узаемадапамогі і творчасці.

Усё гэта ў поўнай меры адносіцца і да арганізацыі самастойнай работы студэнтаў музычных спецыялізацый універсітэта. Аднак тут ёсць і свая спецыфіка. Справа ў тым, што значная колькасць заняткаў па дысцыплінах спецыялізацый праводзіцца ў індывідуальнай форме. Гэта нармальная еўрапейская практыка навучання прафесійнаму музычнаму мастацтву розных жанраў. Але ў гэтым выпадку роля

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

выкладчыка ў арганізацыі і якасці самастойнай работы студэнтаў ўзрастае.

Як вядома, адукаваны, удумлівы педагог здольны абудзіць веру студэнта ў асабістыя сілы і развіць патрэбнасць у творчасці.

Патрэбна звярнуць увагу і на тое, што калі размова вядзецца пра музычную адукацыю, то неабходна ведаць наступнае: мае спецыфіку і сам прадмет дзейнасці (музыка — не навука ў строгім сэнсе гэтага слова, а від мастацтва). Менавіта спецыфіка патрабуе пэўнага ўзроўню самастойнасці пры інтэрпрэтацыі музычных твораў, паслядоўнасці і сістэматычнасці ў рабоце, этапнасці ў засваенні музычнай формы твора. Студэнты вучыліся гэтаму яшчэ ў сярэдніх спецыяльных музычных установах. А вышэйшая школа садзейнічае далейшаму ўдасканаленню індывідуальнага прафесійнага майстэрства.

Прапаноўваючы заданні для самастойнай работы практычна па ўсіх дысцыплінах музычных спецыялізацый, ніколі немагчыма рэгламентаваць дзейнасць студэнта і прадугледзець у поўнай меры канчатковы вынік, таму што ў любым выпадку гэта дзейнасць будзе характарызавацца як творчая і ў выбары сродкаў, і ў выбары метадаў яе рэалізацыі.

Для актывізацыі самастойнай творчай дзейнасці па дысцыплінах спецыялізацый на кафедрах існуюць цікавыя, на наш погляд, формы работы: міжсесіённы кантроль, конкурсы па розных спецдысцыплінах, справаздачныя канцэрты класаў, кафедраў, універсітэта, удзел у фестывальным і канцэртным жыцці за межамі універсітэта. Гэта сведчыць аб тым, што прафесійны ўзровень студэнтаў універсітэта не толькі дастаткова высокі, але і запатрабаваны шырокай аўдыторыяй слухачоў і гледачоў.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Аднак нельга не звярнуць увагу на існуючыя праблемы.

1. На сённяшні дзень вельмі востра стаіць праблема забеспячэння аўдыторным фондам і музычным інструментарыем студэнтаў для самастойных заняткаў.

2. Даволі актуальнай застаецца праблема актывізацыі самастойнай работы студэнтаў IV—V курсаў па дысцыплінах спецыялізацый і кантролю выкладчыкаў за яе якасцю.

3. Востра стаіць праблема навучання студэнтаў музычных спецыялізацый навыкам вядзення самастойнай даследчай работы.

4. Пры распрацоўцы заданняў для самастойнай работы па дысцыплінах агульнанавуковага і агульнаспецыяльнага цыклаў для студэнтаў музычных спецыялізацый можна параіць выкарыстоўваць пераважна творчыя і эўрыстычныя віды заданняў. Гэта, на наш погляд, істотны рэзерв для павышэння якасці выканання самастойных работ.

Такім чынам, самастойная работа — вядучая, актывізуючая форма навучання, фундамент, на якім будуецца ўся сістэма фарміравання асобы высокакваліфікаванага спецыяліста ў галіне культуры. Дапамагчы студэнту зрабіць самастойную работу абавязковай для сябе — першапачатковая задача выкладчыкаў вышэйшай школы.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ